Дзень роднай мовы будзе адзначацца ў краіне на наступным тыдні. Выставачны праект «Маляўнічыя арнаменты родных моў», падрыхтаваны з гэтай нагоды, прадстаўляе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. А працавалі над ім у НББ сумесна з грамадскім аб'яднаннем украінцаў «Ватра», Мінскім грамадскім аб'яднаннем украінцаў «Запавіт» і таварыствам дружбы народаў «Беларусь — Украіна». Выстаўка адкрылася 14 лютага. Ідэя праекта — паказаць багацце, хараство і непаўторнасць беларускай і ўкраінскай моў, іх непарыўную сувязь з народнай творчасцю, падкрэсліць лейтматыў мовы ў вышыўцы, жывапісе і друкаваным слове.